Клас: 8 Дата: ________________

Тэма: **Двухсастаўныя сказы. Дзейнік і выказнік**

Мэты:

- дапамагчы набыць уяўленне аб парадыгме простых сказаў, іх будове і значэні;
- выпрацоўваць уменні выяўляць двухсастаўныя сказы ў тэксце, аналізаваць іх будову;
- выхоўваць пачуцці прыязнасці да маці.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант

*Голас незнаёмага можа здзівіць,*

*Голас друга --на хвіліну спыніць,*

*Голас любай --сагрэць сонцам лета,*

*Голас маці –вярнуць з таго свету.*

*Максім Танк*

### II. Арфаграфічная хвілінка.

Заданне: адзначце словы, якія з не пішуцца разам і растлумачце ваш выбар.

1. (Не)хта;
2. (Не)вялікая бяда;
3. (Не)высокі, а нізкі;
4. (Не)паабедаўшы;
5. Падлога (не) памыта;
6. (Не)адрамантаваны плот;
7. (Не)барака.

Адказы: 1,2,6,7.

### III. Праверка дамашняга задання

Выкананне задання на адукацыйнай інтэрнэт-пляцоўцы LearningApps.org: https://learningapps.org/display?v=p8bszcir520

## IV. Знаёмства з новай тэмай

Зварот да эпіграфа.

*Зрабіць сінтаксічны разбор сказа.*

Мэтавызначэнне.

*Ці ва ўсіх сказах заўсёды бываюць і дзейнік, і выказнік?*

Называнне тэмы ўрока і мэт

Чытанне правіла параграфа 14.

Выкананне ілюстрацыйнага практыкавання 226.

Фізкультхвілінка.

*Калі настаўнік называе назоўнік – вучні падымаюць рукі ўверх, калі прыметнік – хлопаюць унізе.*

Вуліца, стол, кацяня, вясёлы, зялёная, чытаць, часопіс, вяселле, звонкі, падлога, вавёрчын, белае.

*Зарадка для вачэй.*

## V. Фарміраванне ўменняў і навыкаў

***Прытча пра маці***

Тры жанчыны бралі ваду ў калодзежы.

Да іх, гамонячы, падышлі сыны. Адзін пацалаваў маці і пабег далей.

Другі запытаў: ”Ты не стамілася, матуля?” І, весела напяваючы, пабег за таварышам.

**Трэці моўчкі ўзяў вёдры ў маці, панёс іх дадому.**

Усё гэта міжволі бачыў самы мудры чалавек у сяле.

-- Скажы, мудрэц, -- запыталі маці, -- чый сын самы лепшы?

-- О, жанчыны, тут быў толькі адзін сын, -- адказаў стары.

*Зрабіць сінтаксічны разбор выдзеленага сказа.*

Творчая хвілінка

*Складзіце звязны тэкст, зрабіўшы з неразвітых сказаў развітыя. Не парушайце граматычную аснову сказаў (не дабаўляйце дзейнікі і выказнікі, калі іх няма).*

Раніца. Свята. Мама сумавала. Дзеці прачнуліся. Пацалавалі, падарылі ўсмешку. Твар засвяціўся.

## VI. Дамашняе заданне

Параграф 14. Практыкаванне 107.

VII. **Рэфлексія**

**VII. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне і каменціраванне адзнак**